**Літаратурная КВіЗ-гасцёўня “Да майстэрства – праз творчасць!”**
**(да 95-годдзя з дня нараджэння У. Караткевіча)**

**Галіна Мар'янаўна Лявон**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
Радунскай сярэдняй школы
Воранаўскага раёна

**Пазакласнае мерапрыемства падрыхтавана да 95-годдзя з дня нараджэння У. Караткевіча для 5-8 класаў. Вучням прапануецца тэарытычны і практычны матэрыял па жыццёваму і творчаму шляху пісьменніка. Заданні прымяркоўваюць развіццё пазнавальных здольнасцей навучэнцаў.**

**Мэта**: сістэматызацыя ведаў пра жыццёвы і творчы шлях У.Караткевіча, развіццё пазнавальных здольнасцей вучняў, іх інтэлектуальных уменняў.
**Задачы:**
- абагульніць веды пра жыццёвы і творчы шлях У.Караткевіча,
- развіваць лагічнае мысленне, памяць, удасканальваць камунікатыўныя ўменні;
- выхоўваць цікавасць да вывучэння беларускай літаратуры.

**Абсталяванне:** мульціборд, рабочыя лісты з заданнямі для каманд (“Літаратуразнаўцы”, “ Біёграфы”, “Аналітыкі”, “Даследчыкі”), прэзентацыя “Жыццёвы і творчы шлях У. Караткевіча”, інсцэніроўка ўрыўка з казкі “Лебядзіны скіт”.
**Удзельнікі:** 5-8 класы.

**Ход мерапрыемства**

**Настаўнік:** Вітаю ўсіх прысутных на мерапрыемстве, прысвечаным 95-годдзю з дня нараджэння У. Караткевіча – знакамітага беларускага пісьменніка. Наша спаборніцтва будзе праходзіць у форме літаратурнай КВіЗ-гасцёўні “Да майстэрства – праз творчасць!”.
Просім удзельнікаў заняць свае месцы.
*Агучванне назваў камандаў. Прадстаўленне членаў журы.*
Удзельнікі тэатра-студыі “Вытокі” пазнаёмяць вас з жыццёвым і творчым шляхам пісьменніка, прадэкламуюць вершы паэта, пакажуць тэатралізацыю па творы “Лебядзіны скіт”. Ваша задача ўважліва слухаць і запамінаць. Кожная каманда павінна запісаць 4 пытанні для другой каманды.
**Падрыхтаваны вучань чытае верш “На Беларусі Бог жыве”**

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

*«На Беларусі Бог жыве» —*
*Так кажа мой просты народ.*
*Тую праўду сцвярджае раса у траве*
*І адвечны зор карагод.*
*Тую праўду сцвярджае*
*Упартасць хваль,*
*І продкаў запавет,*
*І мовы залатая сталь,*
*І нашых дум сусвет…*

**Вядучы:** *(выступленне суправаджаецца паказам прэзентацыі)* Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч – паэт, празаік, драматург, публіцыст, перакладчык, кінасцэнарыст. Нарадзіўся 26 лістапада 1930 года ў г. Орша Віцебскай вобласці. Першы пісьменнік, які звярнуўся да жанру гістарычнага дэтэктыву. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Івана Мележа (1983 г. – за раман «Нельга забыць») і Літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа (1984 г. – за раман «Чорны замак Альшанскі»). Бацька – Сямён Цімафеевіч (1887– 1959) – паходзіў са старадаўняга шляхецкага роду, закончыў гарадское вучылішча ў Оршы, працаваў у казначэйстве, служыў у царскай арміі пісарам, пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі быў супрацоўнікам фінансавых органаў.

Маці – Надзея Васільеўна (1893–1977) – таксама паходзіла са старадаўняга шляхецкага роду, з роду Грынкевічаў. Пасля заканчэння Марыінскай гімназіі ў Магілёве некаторы час працавала настаўніцай, потым была хатняй гаспадыняй.

**Падрыхтаваны вучань чытае верш “Бацька”**

*Бярозкі ствол усхвалявана-тонкі,*
*Пясчанікавых скал крутыя йлбы,*
*Над берагам зялёным явар звонкі*
*І моцныя, спрадвечныя дубы.*
*Вось бусла ва гняздо над старай хатай*
*Вячэрнім, залатым агнём гарыць*
*І там, ля пуні, дзе вішняк калматы,*
*Сплятае сетку бацька мой стары.*
*Даткнуцца б рук яго, такіх знаёмых,*
*Карычневых ад сонца і зямлі,*
*Ад сонца, што цяплей за ўсё удома,*
*Ад той зямлі, дзе ён і я раслі.*

У сям’і было трое дзяцей: сын Валерый (1918 – загінуў у 1941 г. на вайне), дачка Наталля (1922–2003), сын Уладзімір. Вялікі ўплыў на Уладзіміра аказаў дзед па лініі маці Васіль Юльянавіч Грынкевіч (1861 – 1945).

Уладзімір навучыўся чытаць у тры з паловай гады. У шэсць гадоў ім былі напісаны першыя вершы. У 1938 г. Валодзя пайшоў у школу ў Оршы.
Пасля заканчэння трэцяга класа ў пачатку лета 1941 г. прыехаў у Маскву да старэйшай сястры Наталлі, якая вучылася там у хіміка-тэхналагічным інстытуце.Там яго і застала вайна. Восенню 1944 г. сям'я вярнулася ў Оршу.

**Падрыхтаваны вучань чытае верш "Беларуская песня"**

*Дзе мой край? Там, дзе вечную песню пяе Белавежа,*
*Там, дзе Нёман на захадзе помніць варожую кроў,*
*Дзе на ўзвышшах Наваградскіх дрэмлюць суровыя вежы*
*І вішнёвыя хаты глядзяцца ў шырокі Дняпро.*
*Ты ляжыш там, дзе сіняя Прыпяць ласкава віецца,*
*Дзе Сафія плыве над Дзвіною, нібы карабель...*
*Там, дзе сэрца маё з першым крокам, як молат, заб'ецца,*
*Калі б нават сляпым і глухім я прыйшоў да цябе.*

З канца 1946 г. яны пачалі жыць ва ўласным доме, куды ў пазнейшы час Уладзімір Караткевіч будзе прыязджаць і працаваць над сваімі творамі. У 1949 г. Уладзімір Караткевіч закончыў сярэднюю школу і паступіў на рускае аддзяленне філалагічнага факультэта Кіеўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Т. Шаўчэнкі. Тут вы бачыце дом у Рагачове, які пабудаваў дзед. Менавіта тут былі напісаны многія яго творы. У пачатку творчага шляху Караткевіч звярнуўся да беларускай гісторыі і фальклору: творы «Казкі і легенды маёй Радзімы», «Лебядзіны скіт», казка «Вужыная каралева».

**Інсцэніроўка ўрыўка з казкі "Лебядзіны скіт" (дзеючыя ролі: Хан, Юсуфі, Старац, Аўтар)** *(урывак выбіраецца па меркаванні настаўніка).*

Асобным выданнем раман «Нельга забыць» («Леаніды не вернуцца да Зямлі») выйшаў толькі ў 1982 г. У 1983 г. за раман Уладзіміру Караткевічу прысуджана Літаратурная прэмія імя Івана Мележа. У 1967 г. паводле сцэнарыя Караткевіча быў зняты кінафільм «Хрыстос прызямліўся ў Гародні». У 1969 г. выйшаў паэтычны зборнік «Мая Іліяда». У 1977 г. выдадзены нарыс пра зямлю Беларусі, яе гісторыю, прыроду і культуру «Зямля пад белымі крыламі». Уладзімір Караткевіча пісаў творы і для юных чытачоў. У 1975 г. выйшаў у друк яго зборнік «Казкі». У 1979 г. у часопісе «Маладосць» быў надрукаваны вострасюжэтны дэтэктыўна-прыгодніцкі раман «Чорны замак Альшанскі».

**Падрыхтаваны вучань чытае верш "Бацькаўшчына"**

*Дагарэў за брамай небакрай,*
*Месяц паміж воблачкаў плыве.*
*Выйду зноў, як у мінулы май,*
*Басанож прайдуся па траве.*
*Дымная, сцюдзёная раса,*

*Цёмныя ў траве ад ног сляды.*
*А такога рослага аўса*
*Я не бачыў доўгія гады.*
*Бач, хмызы спляліся, як павець,*
*Светлякі мігцяць, гараць святлей.*
*Перад тым як звонка ў лозах пець,*
*Прачышчае горла салавей.*

У 1980 г. у сувязі з 50-годдзем Уладзімір Караткевіч быў узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў. У 1983 г. ад цяжкай хваробы памерла яго жонка Валянціна Браніславаўна. На 54-м годзе жыцця Уладзімір Караткевіч памёр. Пахаваны ён у Мінску на Усходніх могілках. У Мінску, Оршы, Віцебску і Кіеве пастаўлены помнікі Уладзіміру Караткевічу. У 2000 г. у г. Оршы адкрыты музей пісьменніка .

**Падрыхтаваны вучань чытае верш “Бог пайшоў. Жыццё ідзе пад кручу”.**

*Бог пайшоў. Жыццё ідзе пад кручу.*
*Але йдзі і не губляй спакой.*
*Ёсць замест прыватнай неўміручасці —*
*Бессмяротнасць нацыі тваёй.*
*Ты памрэш. Але ў бязмежным свеце*
*Будуць працвітаць твой Люд і Край...*
*Вер, што ў гэтым, вер, што толькі ў гэтым*
*Шчасце пасмяротнае і рай.*

**Заданне 1 “Задай пытанне “** *(падчас слухання біяграфіі У. Караткевіча ўдзельнікі кожнай каманды павінны былі запісаць па 4 пытанні, каб задаць іх другой камандзе).* Максімальная колькасць балаў – 4.

**Магчымыя пытанні:**

Які і чый юбілей адзначаем 26 лістапада? *(95-годдзе У. Караткевіча.)*

Колькі гадоў адмераў лёс гэтаму пісьменніку? *(54.)*

Колькі дзяцей было ў сям’і, у якой нарадзіўся пісьменнітк? *(Трое.)*

У 1980 г. у сувязі з 50-годдзем якую ўзнагароду атрымаў Уладзімір Караткевіч? *(Быў узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў.)*

**Заданне 2 “Так ці не”.** Адзначце правільныя і няправільныя сцвярджэнні. Максімальная колькасць балаў – 7.

| | |
|---|---|
| Хан Бату быў перакананы, што палонныя людзі хутка забудуць мову сваю і сваю зямлю | (+) |
| Паэт Юсуфі меркаваў, што ў скіт увойдзе 20 чалавек | (+) |
| Чаму старац выбірае смерць? Бо ён і так ўжо стары | (-) |

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

| | |
|---|---|
| Старац ператварыўся ў вужа | (-) |
| Ад лебядзінага апярэння стала белай вопратка ў яе людзей | (+) |
| Паэт Юсуфі збіраўся пакінуць пасля сябе песню | (+) |
| Народ , на думку хана Бату, гэта статак, у якім кожная жывёла думае толькі аб тым, каб есці другіх і не быць з'едзенай. | (+) |

**Заданне 3 "Жыццёвыя дарогі".** Устаўце прапушчаную інфармацыю ў тэкст, карыстаючыся матэрыялам для даведак. Максімальная колькасць балаў – 12.

Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч – паэт, …….. драматург, публіцыст, перакладчык, ……. Нарадзіўся ……. 1930 года ў г. Орша Віцебскай вобласці. Першы пісьменнік, які звярнуўся да жанру гістарычнага ……. Бацька паходзіў са старадаўняга шляхецкага роду, працаваў у ……. Маці паходзіла са старадаўняга шляхецкага роду, ………. Уладзімір навучыўся чытаць у . …….. У …….гадоў ім былі напісаны першыя вершы. У …… Валодзя пайшоў у школу ў Оршы. У ……. былі напісаны многія яго творы. На ……. жыцця Уладзімір Караткевіч памёр. У ………. адкрыты музей пісьменніка.

<u>Матэрыял для даведак</u>: *кінасцэнарыст, 26 лістапада, дэтэктыву, празаік, казначэйстве, тры з паловай гады, шэсць, 1938 г., 2000 г. у г. Оршы, Рагачове, 54-м годзе, з роду Грынкевічаў.*

**Заданне 4. "Верш-візітоўка".** Расстаўце радкі верша "Бацькаўшчына" ў правільным парадку. Максімальная колькасць балаў –12 (за кожны няправільны радок балы адымаюцца).

(1)Дагарэў за брамай небакрай,
(4)Басанож прайдуся па траве
(3)Выйду зноў, як у мінулы май,
(2)Месяц паміж воблачкаў плыве.
(5)Дымная, сцюдзёная раса,
(8)Я не бачыў доўгія гады.
(9)Бач, хмызы спляліся, як павец,
(6)Цёмныя ў траве ад ног сляды.
(7)А такога рослага аўса
(11)Перад тым як звонка ў лозах пець,
(10)Светлякі мігцяць, гараць святлей.
(12)Прачышчае горла салавей.

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

**Заданне 5 “Яны глядзяць на нас з партрэта”**. Размяркуйце фотаздымкі згодна прапанаванай табліцы. Максімальная колькасць балаў – 7.

| У.Караткевіч | Р.Барадулін | М.Багдановіч | К.Каліноўскі |
|---|---|---|---|
|   |   |  |   |

| У.Караткевіч | Р.Барадулін | М.Багдановіч | К.Каліноўскі |
|---|---|---|---|
















**Заданне 6 “Творчая спадчына”.** Адзначце сярод прапанаваных творы, якія не належаць пяру У. Караткевіча . Максімальная колькасць балаў – 4.

| |
|---|
| Казка “Разумная дачка”, казка “Нямоглы бацька”, Верш “На Беларусі Бог жыве”, казка “Лебядзіны скіт”, нарыс “Зямля пад белымі крыламі”, верш |

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ
ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

| |
|---|
| “Калі ласка”, раман “Чорны замак Альшанскі”, раман “Людзі на балоце”, газета “Мужыцкая праўда”, верш “Дзе мой край”. |

Казка “Разумная дачка”, казка “Нямоглы бацька”, Верш “На Беларусі Бог жыве”, казка “Лебядзіны скіт”, нарыс “Зямля пад белымі крыламі”, верш “Калі ласка”, раман “Чорны замак Альшанскі”, раман “Людзі на балоце”, газета “Мужыцкая праўда”, верш “Дзе мой край”.

**Настаўнік:** Для падвядзення вынікаў слова прадстаўляецца членам журы.

*Аб’яўленне і ўзнагароджванне пераможцаў.*

Усім удзельнікам вялікі дзякуй. Спадзяёмся, што імя У. Караткевіча назаўсёды застанецца ў вашых сэрцах!

## Літаратура


1. **Верабей, А.** Уладзімір Караткевіч: жыццё і торчасць / А.Верабей.- 2-е выд., дапрац. і выпраўлен. – Мінск: Беларус.навука, 2005. – 269 с.
2. **Забродская, В.** “Самая цікавая навука – жыццё”: Пазакласнае мерапрыемства (IX–XI класы) // Роднае слова. – 2020. – №10. – с.90
3. **Лойша, Т.** Гульня-віктарына «Шчаслівы выпадак» па творчасці Уладзіміра Караткевіча (для 8-10 класаў) / Т. Лойша // Беларуская мова і літаратура. – 2020. – № 11. – С. 59–61.
4. **Петрашкевіч, М.** Свет Уладзіміра Караткевіча: Гульня (X–XI класы) // Роднае слова. – 2020. – №10. – с.79


ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА